УДК 947.6.«1917»

**І. М. Рыжанкоў**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# АГРАРНЫ РУХ У БЕЛАРУСІ Ў ПЕРСПЕКТЫВЕ ВЫРАШЭННЯ ЗЯМЕЛЬНАГА ПЫТАННЯ (чэрвень – жнівень 1917 г.)

У артыкуле асвятляецца аграрны рух у беларускіх губернях на этапе разгортвання рэвалюцыйных падзей, якія ахапілі Расію летам 1917 г. Аўтар адзначае, што з чэрвеня па жнівень харчовыя, зямельныя і валасны камітэты разгортваюць працу па шэрагу накірункаў. Зямельныя камітэты засяродзілі сваю дзейнасць не столькі на падрыхтоўцы аграрнай рэформы, колькі на задавальненні за кошт памешчыцкай і казённай уласнасці патрэб вясковага (абшчыннага) сялянства ў сенакосах, пашы, лесе і паліве. Канфлікты, якія ўзнікалі ў выніку іх дзейнасці паміж зацікаўленымі бакамі, як правіла, завяршаліся на карысць мясцовых сялянскіх грамадстваў. Летам 1917 г. урадавымі і грамадскімі сіламі ўдалося стрымаць захопніцкі рух. Дзякуючы тлумачальнай і асветніцкай працы, далучэнню сялян да кіраўніцтва, аграрныя парушэнні не набылі масавы характар. Са жніўня вяскоўцы пачынаюць ухіляцца ад выканання хлебнай манаполіі і іншых урадавых праграм.

**Ключавыя словы:** рэвалюцыя, захоп зямлі, аграрнае пытанне, «рэвалюцыйная дэмакратыя».

**I. M. Ryzhankou**
Belarusian State Technological University

# AGRARIAN MOVEMENT IN BELARUS IN THE FUTURE SOLVING THE LAND ISSUE (June – August 1917)

The article reveals the agrarian movement in the Belarusian provinces at the stage of deployment of the revolutionary events that swept Russia in the summer of 1917. the Author notes that in June – August, food, land and parish committees are working in a number of directions. The land committees focused their activities not so much on the preparation of agrarian reform, but on meeting the needs of the rural (communal) peasantry in haymaking, pastures, forests, and fuel at the expense of landowners and state property. Conflicts that arose as a result of their activities between interested parties usually ended in favor of local peasant societies. In the summer of 1917, government and public forces managed to contain the invading movement. Thanks to the explanatory and educational work, the joining of peasants to the work of the committees, agricultural violations did not become widespread. Since August, the villagers are beginning to evade the implementation of the grain monopoly and other government programs.

**Key words:** revolution, the seizure of land, the agrarian question, the «revolutionary democracy».

**Уводзіны.** Галоўным клопатам урадавых структур у Расійскай дзяржаве летам 1917 г. з'яўлалася забеспячэнне франтавікоў харчаваннем, падтрыманне законнасці, грамадскага парадку ў гарадах і вёсках, недапушчэнне гвалтоўных захопаў прыватнаўласніцкай зямлі [1]. Вялікую ролю ў гэтым працэсе надавалі дэмакратычна абраным органам – камісарыятам, валасным, харчовым і зямельным камітэтам. Задачай апошніх з'яўлялася падрыхтоўка да аграрнай рэформы, збор необходнай інфармацыі да склікання Устаноўчага сходу і канчатковае вырашэнне наспелага патыння аб зямлі [2]. Неўзабаве таму аграрнае пытанне гучала цэтральнай тэмай у парадку дня і рэзалюцыях грамадска-палітычных структур – Саветаў дэпутатаў, партыйных арганізацый. Саветы пагадзіліся пачакаць правядзення рэформы законным чынам абраннікамі народа ва Устаноўчым сходзе.

**Асноўная частка.** Значную цікавасць грамадства выклікалі вынікі працы Усерасійскага сялянскага з'езду. Змест «Пастановы па зямельным пытанні» ад 25 мая 1917 г. мусіў, акрамя іншага, пераканаць сялянства ў тым, «што з гэтага часу не толькі канчатковае вырашэнне зямельнага пытання ва Устаноўчым сходзе, але і ўся справа падрыхтоўкі гэтага вырашэння ў цэнтры і на месцах работамі мясцовых і Галоўнага зямельных камітэтаў пераходзіць у рукі самога працоўнага насельніцтва». Паказальна і тое, што да выдання адмысловай пастановы ўсе зямельныя здзелкі, здзейсненыя пасля 1 сакавіка, лічыліся несапраўднымі.

Важнейшыя палажэнні пастановы атрымалі адбітак у рэзалюцыях чэрвеньскіх сялянскіх

з’ездаў Віцебскай і Ковенска-Віленскай губерняў. Як і ў выпадку з рэзалюцыяй сялянскага з’езду Мінскай губерні «Па зямельным пытанні», у шэрагу месцаў яна ўспрымалася як закон. У прыватнасці, як паведамляла «Народное слово» ад 20 чэрвеня 1917 г., у Рагачоўскім павеце пад уздзеяннем агітацыі дэлегатаў Усерасійскага з’езду «сяляне сякуць лясы, дзеляць лугі, здымаюць рабочых і ўстараняюць адміністрацыю з маёнткаў» і г. д.

Прынятыя 15–17 чэрвеня на пасяджэнні Магілёўскага губернскага зямельнага камітэта рашэнні аб пераглядзе ўсіх дагавораў, памераў арэнднай платы і іншыя паскорылі перадачу сялянам у карыстанне ўласніцкіх выганаў і сенакосаў. Як паведамлялася ў справаздачы Быхаўскага зямельнага камітэта, «гаспадарам пакінуты лугі па спажывецкай норме іх жывёлы, зразумела, не паўсюдна дакладна і справядліва, [але] памешчыцкай жывёле пагібель не пагражае» [3].

Газета «Народное слово» ад 21 верасня паведамляла аб парушэннях ў маёнтку «Дрыгучы» Дзісненскага павета Віленскай губерні, дзе перадача камітэтамі ў распараджэнне сялян сенакосаў вымусіла ўладальніка ліквідаваць малочную гаспадарку.

Перспектыва поўнай ліквідацыі царкоўнага землеўладання ўсведамлялася самімі іерархамі. У «Новом Варшавском утре» ад 7 чэрвеня адзначалася, «Прызнаючы, што зямля павінна быць аддадзена працоўнаму народу, – гаварылася ў рэзалюцыі дэлегатаў Мінскай епархіі, – з’езд лічыць, что царкоўныя землі адчужаюцца з ведама прыходскіх саветаў». Але гэта і падобныя на яе пастановы не стрымлівалі сялянскага захопнага руху. Так, 18 чэрвеня Лубянецкае грамадства Быхаўскага павета «60 дзесяцін царкоўнай зямлі падзяліла паміж усімі грамадзянамі па роўнай частцы ў часовае карыстанне». А напачатку ліпеня сяляне навакольных вёсак самавольна скасілі 25 дзесяцін сенакосу, выдзеленага харчовай управай Буйніцкаму жаночаму манастыру [4].

Паводле звестак Дрысенскай харчовай управы, «па скаргах на самавольныя дзеянні насельніцтва супраць зямельных уласнікаў», якія адбыліся ў павеце з 5 ліпеня па 2 жніўня, з агульнай лічбы 25 – 11 выпадкаў уяўлялі сабой «захоп і падзел царкоўных сенакосаў» [5]. Такім чынам, нават рэлігійныя пачуцці сялянства не стрымлівалі яго захопніцкіх настрояў.

Напрыканцы чэрвеня – напачатку ліпеня ў шэрагу мясцін беларускіх губерняў адзначалася паслабленне аграрнага руху. Так, на старонках газеты «Витебский листок» ад 27 чэрвеня паведамлялася, што 25 чэрвеня на пасяджэнні Віцебскага губернскага зямельнага камітэта адзначалася, што «ў губерні спакойна... Памешчыкі ідуць насустрач сялянам у іх патрэбах, дзякуючы чаму ўзаемаадносіны не абвастраюцца». Па словах прадстаўнікоў зямельных камітэтаў, у Веліжскім, Дзвінскім, Дрысенскім, Полацкім, Рэжыцкім, Себежскім паветах аграрных парушэнняў не назіралася. Пэўныя прэтэнзіі былі выказаны на адрас улад Люцынскага (самавольныя парубкі лесу і пасьба жывёлы), Гарадоцкага (здача сялянам у арэнду па «мізэрных цэнах»), Невельскага (адхіленне ад работ ваеннапалонных) паветаў [6].

Адносна спакойнае становішча назіралася на Міншчыне. Паведамляла «Крестьянская газета» ад 5 ліпеня, што на нарадзе выканкама Савета сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў з выступлення прадстаўніка Бабруйскага павета Богдана вынікала, што памешчыкі яшчэ былі гаспадарамі сваёй уласнасці, і толькі ўсталяваныя імі «вялікія грошы за арэнду зямель [выклікалі] маленькія непаразуменні». А дэпутат Кавалёў з Барысаўскага павета казаў, што іх зямельныя камітэты «імкнуцца палепшыць быт сялян і не пакрыўдзіць усё ж памешчыкаў».

Да сярэдзіны лета сялянскі рух пайшоў на ўздым, але, можна меркаваць, не па віне зямельных камітэтаў. Пра ўзрослыя замахі сялянства на чужую ўласнасць, у прыватнасці, сведчыць зварот таварыша міністра харчавання ад 14 ліпеня ў Мінскую губернскую харчовую ўправу. «...Па пастановах валасных выканаўчых камітэтаў Мінскай губерні, – гаварылася ў тэлеграме, – усе маёнткі раздаюцца сялянам у арэнду. Прычым сяляне не дапускаюць ставіць на пашу памешчыцкіх лугоў казённую гуртавую жывёлу, перашкаджаючы арэндзе лугоў інтэнданцтвам. Маючы на ўвазе, што [на] Захфронце з прычыны крайне недастатковага падвозу жывёлы і мяса з краіны [у] цяперашні час адбываецца рэквізіцыя жывёлы, апаса[емся], што прынятая па рэквізіцыі жывёла застанецца без корму, таму, звяртаючыся да вас за садзеяннем, прашу растлумачыць насельніцтву шкоду, якая наносіцца справе забеспячэння арміі, самачынных захопаў прыватнаўласніцкіх лугоў...» [7].

Аналагічная сітуацыя складвалася і ў шэрагу месцаў Віцебшчыны. Пасля разбору скаргі памешчыка Данілава аб захопе пакосаў ад 19 ліпеня высветлілася, што, сапраўды, у беспарадках быў вінаваты Ляскавіцкі зямельны камітэт. Падобныя выпадкі мелі месца ў Лепельскім, Полацкім, Гарадоцкім паветах, па віне «старшынь валасных зямельных камітэтаў, заражаных ідэяй бальшавізму», пад уплывам незадаволенай кучкі людзей, якія праводзяць у жыццё ідэі бытавога бальшавізму» [8].

Як вынікала са звестак, адпраўленых у Віцебск Дрысенскай харчовай управай, з 25 аграрных пра-

вапарушэнняў, якія адбыліся ў павеце за ліпень месяц, віна ў 5 выпадках ускладалася на валасныя зямельныя і 3 – на харчовыя камітэты [9].

Варта адзначыць, што летам названыя камітэты карысталіся моцным аўтарытэтам у насельніцтва і, як правіла, не адчувалі патрэбы ў выкарыстанні судовых санкцый супраць захопнікаў чужой маёмасці. У выпадку неабходнасці выкарыстоўваліся захады маральнага ўздзеяння. Так, 1 ліпеня Рагачоўская зямельная ўправа пад страхам турэмнага зняволення запатрабавала ад Лукаўскага камітэта неадкладнага спынення сялянамі в. Задруцця звозу жыта з палёў фальварка «Марусін», які належаў «арандатаршы» Б. Бярковіч [10]. 21 ліпеня Віцебская губернская харчовая ўправа выдала пастанову аб прыцягненні да крымінальнай адказнасці захопнікаў «чужых палёў і лугоў». Прычым у выпадку неабходнасці павятовым зямельным камітэтам прапаноўвалася звярнуцца да ваеннай сілы. 18 жніўня быхаўскі камісар прапанаваў зямельнай управе ўзброеную сілу для вяртання сена, скошанага сялянамі з «арандаванага Упраўленнем Палявога будаўніцтва луга» [11]. У цэлым, у адрозненне ад асобных раёнаў Расіі [12], на Беларусі выкарыстання ўзброенай сілы супраць сялян не спатрэбілася. Што датычыць міліцыі, то яе дзейнасць скіроўвалася галоўным чынам на падтрыманне грамадскага парадку, барацьбу з самагонаварэннем і г. д., але ніякім чынам не супраць аграрнага руху.

Не менш важнай задачай з’яўлялася прадухіленне аграрных правапарушэнняў. На гэта, як адзначалася вышэй, скіроўвалася дзейнасць харчовых і зямельных камітэтаў. Іншая справа, што іх функцыі не былі выразна акрэсленымі і часта перасякаліся. Акрамя таго, члены гэтых камітэтаў, як правіла, мелі розныя ўяўленні аб іх прызначэнні і наогул кампетэнцыі.

Варта адзначыць, што землеўласнікі і арандатары, як правіла, звярталіся ў харчовыя камітэты як больш аўтарытэтныя, на іх думку, органы. 9 ліпеня Руднянскі ляснічы паскардзіўся на Горкаўскі, Дубінінскі, Руднянскі і Старынскі валасныя зямельныя камітэты, якія падзялілі надзелы лясной адміністрацыі і свабодныя сенакосы «па вельмі нізкіх цэнах», а грошы пастанавілі ўнесці ў свае камітэты» [13]. Невыпадкова А. А. Валковіч перадаў скаргу на разгляд не зямельнай, а харчовай управе. Пасля ўмяшальніцтва Казьянскай управы сяляне в. Гараўцы вырашылі адмовіцца ад касьбы сенажаці ў фальварку «Лужыцы», якую ім адмераў зямельны камітэт [14].

Па меры фармавання камісарыятаў, дэмакратызацыі гарадскіх і земскіх самакіраванняў, харчовых і зямельных камітэтаў стваралася магчымасць іх узаемадзеяння ў жыццёва важных сферах, у тым ліку ў аграрным пытанні. У шэрагу мясцін валасныя зямельныя і харчовыя камітэты калегіяльна абмяркоўвалі агульныя праблемы.

Вядома, што прынятыя пастановы не заўсёды задавальнялі зацікаўленых асоб, асабліва сялян, якія імкнуліся выкарыстаць існаваўшыя недакладнасці ў новым парадку землекарыстання ў сваіх мэтах. Так, у чэрвені вяскоўцы Кахановіцкай воласці звярнуліся да зямельнага камітэта (у абход харчовага) з просьбай аб дадатковым выдзяленні сенакосу. Характэрна, што зямельны камітэт не адмовіў ім у тым, але параіў «адводзіць свабодныя надзелы пакосаў толькі тым грамадзянам, якія ўжо ўбралі свае пакосы і яшчэ адчуваюць патрэбу ў іх» [15].

Такім чынам, складвалася становішча, калі ў дзейнасці найбольш шматлікіх валасных выканаўчых, харчовых і зямельных камітэтаў не назіралася скаардынаванасці, неабходнай для рэалізацыі злабадзённых дзяржаўных праблем. Пэўныя спадзяванні на ўрэгуляванне існаваўшых арганізацыйна-практычных супярэчнасцей у аграрным пытанні ўскладаліся на чарговую пастанову Міністэрства земляробства ад 16 ліпеня. Так, паводле адмысловай інструкцыі, зямельным камітэтам у супрацоўніцтве з харчовымі надавалася права нагляду за эксплуатацыяй усіх лясоў і водпускам яго мясцоваму насельніцтву, а таксама перадачы сялянам у карыстанне незапатрабаванай прыватнаўласніцкай рабочай жывёлы і інвентару [16].

У адпаведнасці з цыркулярам Міністра ўнутраных спраў Цэрэтэлі І. права распараджэння незапатрабаванай землеўладальніцкай і іншай маёмасцю належала не зямельным, а выключна харчовым камітэтам. Можна меркаваць, што ажыццяўленне інструкцыі і цыркуляра мела супярэчлівыя наступствы. Так, на Віцебшчыне некалькі палепшылася сітуацыя з незаконнымі дзеяннямі зямельных камітэтаў. У шэрагу месцаў харчовыя камітэты аднавілі сваю кампетэнцыю па распараджэнні незапатрабаванай маёмасцю. Да прыкладу, 25 ліпеня Селішчыцкая валасная харчовая ўправа забрала ад зямельнага камітэта казённы луг ва ўрочышчы Пятроўка памерам 2 дзесяціны і передала яго жыхарам вёскі Аската за 26 руб. 50 кап. [17].

1 жніўня на пасяджэнні Гарадоцкага павятовага харчовага камітэта адзначалася, што ў Селішчыцкай, Уладзімірскай і Таснянскай валасцях назіраліся нязначныя захопы, але «яны не прымалі сур’ёзнага характару, дзякуючы своечасова прынятым захадам». Паводле слоў старшыні камітэта Пакроўскага С., «агульная тэндэнцыя такая, што харчовым органам даводзіцца зараз арганізоўваць тое, што дэзарганізавалі зямельныя камітэты» [18].

Летам з пачаткам збору ўраджаю землеўладальнікі Магілёўскай губерні часта скардзіліся на зямельныя камітэты, прычым, нават на адрас урада. Але мясцовыя кіраўнікі адхілялі абвінавачанні ў прадузятым стаўленні да памешчыкаў. Так, газета «Могилевская жизнь» паведамляла, што падчас пасяджэння прадстаўнікоў губернскіх улад і савецкіх установаў Магілёўшчыны адзначалася, што «зямельныя камітэты робяць спробы знайсці лінію пагаднення для абодвух бакоў». Савецкія дзеячы заяўлялі, што «захопаў ніякіх не назіралася, а ўсё размяркоўвалася зямельнымі камітэтамі». Адзначаючы вялікую арганізацыйную ролю камітэтаў, газета «Молот» ад 22 ліпеня, у прыватнасці, акцэнтавала ўвагу на класавым складзе «гэтых ячэек працоўнага сялянства» і ў той самы час на іх агульнадзяржаўным прызначэнні як абаронцаў «рускай зямлі ад хвалі анархіі».

Усё ж, на думку мінскага губернскага камісарыята, вялікая доля віны за аграрныя парушэнні ўскладалася на зямельныя камітэты. Так, 28 жніўня ў яго звароце ў МУС паведамлялася, што сяляне ў выніку падбухторвання салдат і «неправільных дзеянняў» зямельных камітэтаў «самавольна захоплівалі сенакосы, сады і землі пад азімыя пасевы» [19].

**Заключэнне.** Такім чынам, зямельныя камітэты Беларусі, асабліва валаснога ўзроўню, з моманту свайго ўзнікнення ў маі – жніўні засяродзілі сваю дзейнасць не столькі на падрыхтоўцы аграрнай рэформы, колькі на задавальненні за кошт памешчыцкай і казённай уласнасці патрэб вясковага (абшчыннага) сялянства ў сенакосах, пашы, лесе і паліве. Тыя канфлікты, якія ўзнікалі ў выніку іх дзейнасці паміж зацікаўленымі бакамі, як правіла, завяршаліся на карысць мясцовых сялянскіх грамадстваў. Летам 1917 г. урадавым і грамадскім сіламі ўдалося стрымаць захопніцкі рух. Дзякуючы тлумачальнай і асветніцкай працы, далучэнню сялян да кіраўніцтва, аграрныя парушэнні не набылі масавы і гвалтоўны характар. У той самы час, са жніўня вяскоўцы пачынаюць ухіляцца ад выканання хлебнай манаполіі, з падазрэннем ставіцца да новых урадавых праграм.

Як вынікае з ліста А. С. Поснікава на адрас Часовага ўрада ад 23 жніўня, захопны рух сялянства ў найбольшай ступені выявіў сябе не ў Беларусі, а ў Пензенскай, Казанскай і Курскай губернях [20].

З пачаткам восені, калі збор ураджаю і рыхтоўка фуражу сталі надыходзіць у завяршальную стадыю, калі пры неабходнасці правядзення пасеву азімых у земляробаў не дадалося ўпэўненасці адносна Устаноўчага сходу і лёсу аграрнага пытання, калі стала ўзрастаць патрэба ў паліве на зіму і г. д., гаспадарчая актыўнасць вясковага насельніцтва, у тым ліку яе захопныя праявы, набылі далейшае развіццё і новыя асаблівасці.

## Літаратура

1. Сяменчык М. Я. Вырашэнне харчовай праблемы ў Беларусі ў канцы 1916 – пачатку 1917 г. // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2019. № 1 (221). С. 32–37.
2. Рыжанкоў І. М. Аграрны рух у Беларусі ў перспектыве вырашэння зямельнага пытання (сакавік – май 1917 г.) // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2019. № 1 (221). С. 38–42.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь (НГАРБ). Ф. 2679. Воп. 1. Спр. 1. Л. 61.
4. НГАРБ. Ф. 2679. Воп. 1. Спр. 1. Л. 34.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 624. Воп. 1. Спр. 4. Л. 307–310.
6. НАРБ. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 242. Л. 253.
7. НАРБ. Ф. 640. Воп. 2. Спр. 10. Л. 107.
8. НАРБ. Ф. 628. Воп. 1. Спр. 3. Л. 16.
9. НАРБ. Ф. 624. Воп. 1. Спр. 4. Л. 307–310.
10. НГАБ. Ф. 2090. Воп. 1. Спр. 3. Л. 7.
11. НГАБ. Ф. 2679. Воп. 1. Спр. 1. Л. 76.
12. Волобуев П. В. Экономическая политика Временного правительства. М.: Изд. Академия наук СССР, 1962. С. 455.
13. НАРБ. Ф. 624. Воп. 1. Спр. 7. Л. 264.
14. НАРБ. Ф. 624. Воп. 1. Спр. 7. Л. 154.
15. НАРБ. Ф. 751. Воп. 1. Спр. 1. Л. 14, 17.
16. Дзяржаўны архіў Расійскай федэрацыі (ДАРФ). Ф. 1778. Воп. 1. Спр. 297. Л. 135.
17. НАРБ. Ф. 624. Воп. 1. Спр. 7. Л. 204.
18. НАРБ. Ф. 624. Воп. 1. Спр 7. Л. 98.
19. ДАРФ. Ф. 1796. Воп. 1. Спр. 74. Л. 26.
20. ДАРФ. Ф. 1779. Воп. 1. Спр. 1110. Л. 3.

## References

1. Syamenchyk M. Ya. Solving the food problem in Belarus in late 1916-early 1917. *Trudy BGTU* [Proceeding of BSTU], series 6, History, Philosophy, 2019, no. 1 (221), pp. 32–37 (In Russian).

2. Ryzhankou I. M. Agrarian movement in Belarus in the perspective of solving the land issue (March – Mai 1917). *Trudy BGTU* [Proceeding of BSTU], series 6, History, Philosophy, 2019, no. 1 (221), pp. 38–42 (In Russian).
3. National historic archive of Belarus (NHARB). Fund 2679. I. 1. F. 1. P. 61.
4. NHARB. Fund 2679. I. 1. F. 1. P. 34.
5. National Archives of the Republic of Belarus (NARB). Fund 624. I. 1. F. 4. L. 307–310.
6. NARB. Fund 60. I. 3. F. 242. P. 253.
7. NARB. Fund 640. I. 2. F. 10. P. 107.
8. NARB. Fund 628. I. 1. F. 3. P. 16.
9. NARB. Fund 624. I. 1. F. 4. P. 307–310.
10. NHARB. Fund 2090. I. 1. F. 3. P. 7.
11. NHARB. Fund 2679. I. 1. F. 1. P. 76.
12. Volobuev P. V. *Ekonomicheskaya politika Vremennogo pravitel'stva* [Economic policy of the Provisional government]. Moscow, Akademiya nauk SSSR Publ., 1962. P. 455.
13. NARB. Fund 624. I. 1. F. 7. P. 264.
14. NARB. Fund 624. I. 1. F. 7. P. 154.
15. NARB. Fund 751. I. 1. F. 1. P. 14, 17.
16. State archive of the Russian Federation (SARF). Fund 1778. I. 1. F. 297. P. 135.
17. NARB. Fund 624. I. 1. F. 7. P. 204.
18. NARB. Fund 624. I. 1. F 7. P. 98.
19. SARF. Fund 1796. I. 1. F. 74. P. 26.
20. SARF. Fund 1779. I. 1. F. 1110. P. 3.

## Інфармацыя пра аўтара

**Рыжанкоў Ігар Міхайлавіч** − кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: im@belstu.by

## Information about the author

**Ryzhankou Ihar Mikhaylavich** – PhD (History), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: im@belstu.by

*Пастуniў 23.03.2020*